**Гісторыя і сучасная арганізацыя дзяржаўных устаноў Беларусі**

1. Дзяржавы-княствы на тэрыторыі Беларусі ў XI–XIII стст.: органы ўлады і кіравання, месца і роля хрысціянскай царквы ў палітыцы і кіраванні.
2. Аб’яднанне беларускіх зямель у складзе Вялікага Княства Літоўскага. Дзяржаўныя межы і адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне ВКЛ у сярэдзіне XIII–канцы XVIII стст.
3. Сістэма органаў цэнтральнай і мясцовай дзяржаўнай улады і кіравання Вялікага Княства Літоўскага ў сярэдзіне XIII–першай палове XVI стст.
4. Дзяржаўна-прававое становішча Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай. Сістэма цэнтральных органаў дзяржаўнай улады і кіравання ВКЛ у другой палове XVI – канцы XVIII стст.
5. Канцылярыя вялікіх князёў літоўскіх: функцыі, структура, штат, значэнне дзейнасці для дзяржавы і грамадства ВКЛ.
6. Органы мясцовай улады і кіравання ў Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XVI – канцы XVIII стст. Гарадское самакіраванне.
7. Судовая сістэма Вялікага Княства Літоўскага ў сярэдзіне XIII–першай палове XVI стст.
8. Судовая сістэма Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI – канцы XVIII стст.
9. Дзяржаўны лад, сістэма органаў улады і кіравання Рэчы Паспалітай. Парадак фарміравання і функцыянавання вальнага сейма.
10. Змены ў сістэме органаў дзяржаўнай улады і кіравання Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. Шляхецкія канфедэрацыі і органы іх кіравання.
11. Сістэма органаў дзяржаўнай улады і кіравання на беларускіх землях у канцы XVIII ст. – першай палове XIX ст.
12. Адміністратыўна-тэрытарыяльнае дзяленне і мясцовае кіраванне на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII ст. – першай палове XIX ст.
13. Сістэма органаў дзяржаўнай улады і кіравання на беларускіх землях у другой палове XIX ст. – пачатку XX ст.
14. Буржуазныя рэформы 1860–1880-х гг. і змены ў сістэме органаў мясцовага кіравання на тэрыторыі Беларусі.
15. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і змены ў сістэме органаў дзяржаўнага кіравання Расіййскай Імперыі.
16. I Усебеларускі з’езд у Мінску (снежань 1917 г.). Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, структура і склад яе органаў.
17. Дзяржаўнае будаўніцтва на савецкай аснове і фарміраванне дзяржапарата ў Беларусі ў 1917–1922 гг.
18. Межы дзяржавы і ўнутранае тэрытарыяльна-адміністрацыйнае дзяленне Савецкай Беларусі ў 1919–1939 гг.
19. Сістэма органаў улады і кіравання БССР у 1920-я – 1930-я гг. Уваходжане Беларусі ў склад СССР.
20. Мясцовыя органы кіравання і самакіравання на тэрыторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг.
21. Стварэнне органаў Савецкай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1939 г. Змены ў сістэме дзяржаўнага кіравання напярэдадні і ў гады Вялікай Айчынай вайны.
22. Органы ўлады і кіравання БССР у другой палове 1940-х–1970-я гг.
23. Органы ўлады і кіравання БССР як складовая частка дзяржаўнага апарата СССР у канцы 1970-х – першай палове 1980-х гг. Канстытуцыі СССР 1977 г. і БССР 1978 г.
24. Органы ўлады і кіравання БССР ва ўмовах палітыкі «перабудовы» і рэформы сістэмы вышэйшых дзяржаўных устаноў СССР у другой палове 1980-х – пачатку 1990-х гг.

25. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце. Фарміраванне сістэмы дзяржаўных устаноў Рэспублікі Беларусь ва ўмовах набыцця незалежнасці.
26. Дзяржаўны лад, сістэма органаў улады і кіравання згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь 1994 г. Інстытут прэзідэнцтва.
27. Сістэма цэнтральных органаў дзяржаўнай улады і кіравання Рэспублікі Беларусь згодна са зменамі і дапаўненнямі, унесенымі на рэферэндумах 1996 г., 2004 г., 2022 г.
28. Сістэма мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.
29. Удзел Рэспублікі Беларусь у інтэграцыйных працэсах. Сістэма органаў улады і кіравання Саюзнай дзяржавы.
30. Судовая сістэма Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.

**Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства (гістарычныя аспекты)**

1. Крыніцазнаўства ў сістэме спецыяльных гістарычных дысцыплін.
2. Класіфікацыя гістарычных крыніц.
3. Заканадаўчыя дакументы як крыніцы па гісторыі Беларусі.
4. Актавыя крыніцы па гісторыі Беларусі.
5. Матэрыялы дзяржаўнага справаводства як гістарычная крыніца па гісторыі Беларусі.
6. Судова-следчыя дакументы як крыніца па гісторыі Беларусі.
7. Статыстычныя і ўліковыя матэрыялы як крыніца па гісторыі Беларусі.
8. Асаблівасці беларускага летапісання.
9. Гісторыка-мемуарныя і эпісталярныя крыніцы.
10. Літаратурныя і публіцыстычныя творы як крыніцы па гісторыі Беларусі.
11. Перыядычны друк у Беларусі як гістарычная крыніца.
12. Прадмет, задачы і сучасныя праблемы археаграфіі. Паняцце і прыкметы археаграфічнай публікацыі.
13. Гісторыя беларускай археаграфіі ў першай палове XIX ст. «Беларускі архіў старажытных грамат» І.І. Грыгаровіча – першы беларускі археаграфічны зборнік дакументаў.
14. Гісторыя беларускай археаграфіі ў другой палове XIX – пач. XX стст.
15. Станаўленне нацыянальнай беларускай археаграфіі ў 1920-я – 1930-я гг.
16. Гісторыя беларускай археаграфіі ў 1940-я – 1980-я гг.
17. Сучасная арганізацыя і вынікі археаграфічнай працы ў Рэспубліцы Беларусь.
18. Археаграфічная дзейнасць дзяржаўных архіваў у Рэспубліцы Беларусь.
19. Этапы развіцця архіўнай справы ў Беларусі.
20. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: паняцце, склад дакументаў і асноўныя этапы фарміравання.
21. Архівы мясцовых органаў улады і судовых устаноў Вялікага Княства Літоўскага.
22. Канфесіянальныя архівы Беларусі.
23. Прыватнаўласніцкія архівы Беларусі.
24. Віцебскі і Віленскі цэнтральныя архівы старажытных актавых кніг: гісторыя, склад дакументаў, археаграфічная дзейнасць.
25. Ведамасныя архівы дзяржаўных устаноў на тэрыторыі Беларусі ў перыяд Расійскай Імперыі. Спробы рэформ архіўнай справы ў Расійскай Імперыі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.
26. Цэнтралізацыя архіўнай справы і сетка дзяржаўных архіваў Беларусі ў 1917–1941 гг.
27. Архівы Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.
28. Архіўная справа на Беларусі ў другой палове 1950-х – 1980-я гг.

29. Закон «Аб Нацыянальным архіўным фондзе і архівах у Рэспубліцы Беларусь» 1994 г. і рэарганізацыя сістэмы архіўных органаў і ўстаноў у 1990-я гг.

30. Ведамасныя архівы і галіновыя фонды ў БССР і Рэспубліцы Беларусь.

**Архівазнаўства (тэорыя і методыка)**

1. Архівазнаўства як навуковая дысцыпліна: аб'ект, прадмет, прынцыпы, метады, сувязь з гісторыяй дзяржаўных устаноў, крыніцазнаўствам і археаграфіяй.
2. Структура дзяржаўнай архіўнай службы Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.
3. Нарматыўная прававая і метадычная база па архіўнай справе ў Рэспубліцы Беларусь
4. Нарматыўная прававая і метадычная база па захоўванні электронных дакументаў у Рэспубліцы Беларусь.
5. Класіфікацыя архіўных дакументаў. Узроўні класіфікацыі.
6. Прыкметы класіфікацыі дакументаў на ўзроўні Нацыянальнага архіўнага фонда Рэспублікі Беларусь.
7. Класіфікацыя дакументаў у межах архіва.
8. Віды архіўных фондаў і сістэматызацыя документаў у межах архіўнага фонда.
9. Паняцце, задачы, прынцыпы, крытэрыі і метады экспертызы каштоўнасці дакументаў.
10. Сістэма экспертных органаў у Рэспубліцы Беларусь.
11. Пералікі дакументаў з пазначэннем тэрміна захоўвання.
12. Парадак правядзення экспертызы каштоўнасці ў справаводстве арганізацыі, архіве арганізацыі і ў дзяржаўным архіве.
13. Паняцце камплектавання дзяржаўных архіваў.
14. Крытэрыі вызначэння крыніц камплектавання.
15. Улік дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонда Рэспублікі Беларусь.
16. Асноўная і дапаможная ўліковая дакументацыя дзяржаўнага архіва.
17. Віды прац па забеспячэнні захаванасці дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонда Рэспублікі Беларусь.
18. Аптымальныя ўмовы захоўвання архіўных дакументаў на папяровых носьбітах.
19. Тэмпературна-вільготнасны, светлавы і санітарна-гігіенічны рэжымы ў архівасховішчы.
20. Сістэма навукова-даведачнага апарата дзяржаўных архіваў.
21. Архіўны вопіс як элемент навукова-даведачнага апарата дзяржаўнага архіва.
22. Архіўны каталог і архіўны шляхаводнік як элементы навукова-даведачнага апарата дзяржаўнага архіва.
23. Паказальнікі і агляд фонда як элементы навукова-даведачнага апарата дзяржаўнага архіва.
24. Аўтаматызаваныя інфармацыйна-пошукавыя сістэмы і тэматычныя базы дадзеных як элементы навукова-даведачнага апарата дзяржаўнага архіва.
25. Мэты, формы і накірункі выкарыстання дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонда Рэспублікі Беларусь.
26. Праца чытальнай залы.
27. Выкананне запытаў грамадзян у дзяржаўных архівах.
28. Арганізацыя працы дзяржаўных архіваў.
29. Арганізацыя працы архіваў арганізацый.
30. Аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма (АІС) дзяржаўнага архіва.